Няўдалае асабістае жыццё, пакручасты лёс аб'ядноўваюць працавітую прыгажуню Нінку, якую выракся сын («Нінка, адно жыццё») і мнагадзетную Зінку-пакінду, якая не выносіць адзіноты, шукаючы сваю долю («Каму шчасце»), няшчасную Веру, цудам не загубленую разам з сынам мужам-злодзеем, і безыменную кабету-знахарку з апавядання «Душагрэйка», забытую богам і людзьмі. Пісьменніца арганічна перадае псіхалагічныя нюансы чалавечай асобы, таму верыш, што гэтыя людзі сапраўды жылі ці жывуць, нават узнікае жаданне з імі сустрэцца, пагаварыць.

Міру Лукшу хвалюе праблема маладога пакалення, якое цывілізацыя забірае з вёскі ў Беласток, Варшаву ці нават у Амерыку, Нямеччыну. На іх шляху сустракаюцца не меншыя боль і горыч, якія нельга не зразумець, не растлумачыць. Таму няма ўзаемапаразумення паміж Нінкай і яе дачкой Данкай («Сірата»), таму і бяжыць ад кахання маладзенькая Лілька, памятаючы горкі вопыт сваёй маці («Сланечнік»). Маладыя не хочуць паўтараць памылак сваіх бацькоў, з усіх сіл імкнуцца ў горад, у іх не прынята пытацца дзе хто працуе, яны стараюцца «прыручыць час» [2, с. 49], які, кажучы радкамі з верша Міры Лукшы «згарае ў вечары жанчыны».

Праўдзівая рэальнасць, дакументалізм не зніжаюць мастацкую вартасць прозы пісьменніцы. І ў прозе яна застаецца паэтам. З вялікай павагай, асцярожнасцю, спагадай ставіцца да прататыпаў сваіх тераінь, якія часам жывуць зусім не ў паэтычных абставінах, але паэзія жыве ў іх уражаннях, жаданнях спасцігнуць сябе як непаўторную, непадзельную цэласнасць у гэтым свеце: «Такі свет прыгожы, светлы, чуеш – ён нават і называецца падобна: свет. І тым больш горка робіцца на душы, калі ты адзінокі, не маеш з кім усім дабром сваёй душы падзяліцца» («Дзетачка мая...») [2, с. 66].

## ЛІТАРАТУРА


1. **Крыніца**, 1998, №2. С. 12.
2. **Лукша М.** Дзікі птах верабей. Беласток, 1992. С. 11.


## SUMMARY


*This article deals with Mira Lukash's creative work. She is known to be a journalist, a prosaist, a poetess who lives and works in Belostok region. The peculiarities of the writer's artistic manner are mentiond in the article. New verges of her creative individuality are emphasized there. Urgent problems of modern literary process are analysed by the author. The author of the article highlights general and specific features in the development of Belostok literary tendency.*



*Поступила в редакцию 5.09.2001*